УДК 82.09

# ДАРОГА ДА СЯБЕ, АБО ПРАБЛЕМА ЖЫЦЦЯ І СМЕРЦІ Ў ТВОРЧАСЦІ В.БЫКАВА

*Т.Р. БАГАРАДАВА (Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*Робіцца спроба паказаць ролю філасофіі неапазітывізму і неатамізму пры адлюстраванні сацыяльных праблем. Сістэматызуюцца асноўныя палажэнні філасофіі экзістэнцыялізму і яго месца ў жыцці, называюцца крыніцы ўзнікнення экзістэнцыяльнага філасофскага напрамку. Даецца абгрунтаванне формам чалавечага існавання, вызначаецца сутнасць тэорыі экзістэнцыялізму. Аналізуецца тэрмін «аўтэнтычнае (сапраўднае) існаванне» і сродкі дасягнення чалавекам свободы. Паказваецца значэнне свободы выбору ў чалавечым жыцці. На прыкладзе асобных твораў В. Быкова раскрываецца роля канкрэтнага індывіда ў ацэнцы грамадскіх працэсаў і з 'яў. Акрэсліваюцца асноўныя праблемы і пытанні, якія ўздымае аўтар у сваей творчасці, адзначаюцца способы і сродкі іх перадачы.*

Усім нам вядомы тэзіс: «Жыць у грамадстве і быць свабодным ад грамадства нельга»; ен цалкам вызначаў чалавечыя жыцці на працягу XX ст., пазбаўляючы людзей індывідуальнасці, падпарадкоўваючы іх грамадскаму меркаванню, ставячы на першае месца пачуцце калектывізму, прапагандуючы атэізм і адхінаючы боскія законы.

Дваццатае стагоддзе было багатае на шматлікія, разнапланавыя і ўзаемавыключальныя філасофскія тэорыі, якія адлюстроўвалі сутнасць чалавека і яго месца ў жыцці. У канцы XIX - пачатку XX ст. зробленыя глабальныя адкрыцці ў галіне навукі і тэхнікі вызначалі і вылучалі на першы план філасофію неапазітывізму, галоўным аб’ектам даследавання якой з’яўляецца навука. Прыхільнікі дадзенага напрамку лічылі, што для захавання свайго статуса філасофія павінна адмовіцца ад спекулятыўных светапоглядных праблем і засяродзіць сваю ўвагу на аналізе мовы навукі. Сутнасць дадзенага падыходу зводзіцца да таго, што толькі навука і тэхніка з’яўляюцца адзіным сродкам вырашэння сацыяльных праблем і толькі спецыялісты дадзенай галіны павінны кіраваць тэхнічнымі і іншымі працэсамі грамадства.

Галоўнай апазіцыяй неапазітывісцкай філасофіі з’яўляецца філасофія экзістэнцыялізму, задача якой - даць ацэнку грамадскім працэсам з пункта погляду кожнага канкрэтнага індывіда. У тым жа XX ст. ажыццяўляецца і рэлігійная ідэалогія, а філасофія неатамізму тлумачыць крызіс у грамадстве навер’ем і атэізмам, абвяшчаючы веру і маральныя прынцыпы сродкам ачышчэння і пераадолення крызісу.

Не спыняючыся падрабязна на двух папярэдне ўзгаданых напрамках філасофіі і не робячы спробаў іх усебаковага (бо гэта прэрагатыва філасофіі) аналіза, звернемся да некаторых экзістэнцыялісцкіх тэзісаў, якія найболыд поўна адлюстроўваюць сутнасць чалавека і яго месца ў жыцці. Падкрэсліваючы ролю навукі і тэхнікі, неапазітывізм быў першай сярод філасофскіх тэорый XX ст., якая імкнулася растлумачыць сацыяльныя праблемы. Але сама па сабе навука і тэхніка не маглі абгрунтаваць грамадскія законы, таму разам з тэхнакратычным напрамкам філасофіі пачатку XX ст. апазіцыйная філасофія экзістэнцыялізму імкнулася вызначыць адносіны чалавека і калектыва, падкрэсліць адказнасць чалавека за свае жыцце, яго жаданне быць самім сабой (такім чынам, пацвердзіць чалавечую індывідуальнасць і свабоду выбару).

Менавіта таму дадзеныя тэзісы былі папулярныя ў асяроддзі эліты (пісьменнікаў, паэтаў, мастакоў), а найболыпую падтрымку знайшлі сярод студэнцтва. Вызваленне ад традыцый, патрабаванне сацыяльнай роўнасці - гэта і было студэнцкай рэвалюцыяй, якая мела месца ў 1968 г. у Францыі. Пасля гэтай рэвалюцыі экзістэнцыялізм, уласна кажучы, крыху патух, бо нават ідэйны натхніцель студэнтаў Ж.П. Сартр перайшоў на іншыя філасофскія пазіцыі.

Такім чынам, галоўнай прычынай папулярнасці філасофіі экзістэнцыялізму было тое, што побач з іншымі прадстаўнікамі эліты праваднікамі дадзенага напрамку з’яўляліся і знакамітыя пісьменнікі, якія красамоўна і адначасова пераканаўча маглі данесці да людзей асноўныя палажэнні папулярнай тэорыі.

Галоўнай крыніцай экзістэнцыялізму стала філасофія Ж. Паскаля, С. К’еркегара, Ф. Ніцшэ, Ф. Дастаеўскага, а таксама іх творчасць; такім чынам, у аснову экзістэнцыяльных пошукаў ляглі праблемы чалавека і выбару. Другой састаўной часткай дадзенага напрамку з’явілася філасофія жыцця - заходнееўрапейская інтэлектуальная плынь другой трэці XIX ст., якая набыла наибольшую папулярнасць у 20 - 30-я гады XX ст. Непрыняцце панлагізму, рацыяналізму, пратэст супраць падпарадкавання чалавека таталітарным структурам і нават выступление супраць хрысціянскай маралі - вось галоўныя задачы гэтага філасофскага напрамку. Экзістэнцыялізм выступаў супраць класічных рацыяналістычных традыцый, якія ператваралі пазнаванне ў адзіную чалавечую функцыю. Чалавек жа, паводле філасофіі экзістэнцыялізму, нараджаецца не для пазнавання, а для жыцця. Гэтае жыцце вызначаецца

экзістэнцыяльным жыццевым радам, бо чалавек заняты не пазнаваннем свету, а трывогамі, любоўю, страхам (тэта і есць экзістэнцыяльны жыццевы рад). Спецыфічны спосаб існавання чалавека ў свеце (экзістэнцыя) - гэта неперарыўная няўстойлівасць. У адрозненне ад рэчы, самадастатковай у сваім існаванні, чалавек не проста існуе, а імкнецца быць самім сабой, і праблема чалавека заключаецца ў незавяршаемасці рашэння. Існаванне чалавека выступае ў дзвюх формах: аўтэнтычнае (сапраўднае) існаванне, калі індывід не залежыць ні ад дзяржавы, ні ад грамадства, а робіць свае жыцце сам у адпаведнасці са сваімі памкненнямі (так званая самасць індывіда), і неаўтэнтычнае (несапраўднае) - існаванне «як усе». Чалавек асуджаны на жыцце ў грамадстве, і калі знаходзіцца сам-насам з сабой, разважае пра канчатковасць свайго быцця ў свеце, а знаходзячыся ў грамадстве, падпарадкоўваецца яго законам, імкнецца быць «як усе», заглушаючы сваю сутнасць і адыходзячы ад сапраўднага існавання.

Такім чынам, філасофія экзістэнцыялізму накіравана супраць прыгнету індывідуальнасці, з'яўляецца процістаяннем калектывізму, спробай нанова сцвердзіць чалавечае існаванне як творчасць, свабоду і асабістую адказнасць. Сапраўднасць праяўляецца ў памежнай сітуацыі: менавіта ў хвіліны ўзрушэння чалавек адкрывае для сябе сапраўдны сэнс існавання - калі патрэбна хуткая рэакцыя або выбар. Тады жыцце не належыць чалавеку. Калі чалавек выяўляе сябе, тады ен выяўляе сябе ў навакольным свеце.

Характарыстыка яго існавання (ням. dasein) - «тут быцце». Чалавек не проста існуе, а існуе тут і зараз, а адметнасць «тут быцця» заключаецца ў яго канчатковасці і часовасці, такім чынам, там, дзе існуе чалавек, павінны быць і іншыя, якія з'яўляюцца неабходнай умовай яго існавання. У гэтым праяўляецца «размытасць межаў», якая, побач з дадзенай фактычнасцю быцця, акунае чалавека ў безаблічны свет - той, дзе ен жыве (грамадства, дзяржава, царква, грамадскія інтарэсы). У экзістэнцыялістаў тэты свет называецца «ман» - свет паўсядзеннасці, дзе асоба памірае, індывідуальнасць гіне, дзе ўсе імкнецца ўтрымацца, каб пазбегнуць смерці.

Асноўным спосабам пераадолення гэтага тленнага жыцця з'яўляецца (паводле экзістэнцыялістаў) чалавечае сумленне, якое пераносіць чалавека ў будучае і прымушае разумець смерць як асабісты лес і непазбежнасць, а значыць праектаваць свае жыцце з улікам абставін. Відавочна, што жыцце чалавека - праект, які ажыццяўляецца ім самім, і ў гэтым праекце заключаецца чалавечая свабода.

Адзін ссыльнны рускі паэт дадаў да слова «свабода» эпітэт «салодкая». Свабода шчыра палітая крывей многіх пакаленняў людзей у розных краінах і кантынентах, а таму, сапраўды, заўседы жаданая і чаканая, прычына многіх войнаў і сучасных канфліктаў.

Вайна - гэта арэна, дзе легка прасачыць амаль усе ўзгаданыя намі палажэнні, у дадзеных абставінах чалавек найбольш поўна раскрываецца, рэалізуецца, праяўляецца. В. Быкаў, сам чалавек у мінулым ваенны, не аднойчы паранены варожай куляй і жыццевай няпраўдай, які не раз трапляў у памежныя сітуацыі, здолеў пераканаўча перадаць настрой і ўнутраны стан сваіх герояў. На нашу думку, пісьменнік, які на ўласныя вочы бачыў усю паднаготную ваенных дзеянняў: не толькі перамогі і лаўры, а пакуты, страты і жыццевы бруд, з фатаграфічнай дакладнасцю адлюстраваў праз учынкі і лесы сваіх персанажаў асабістае стаўленне да міжнароднай дзяржаўнай палітыкі, да месца чалавека не толькі ў дзяржаўнай машыне, але і ў Сусвеце. В. Быкаў - тонкі псіхолаг, які адзін з першых звярнуў увагу на так званага «маленькага» чалавека, зазірнуў у яго душу і вывернуў яе навыварат. І пры дэталевым аналізе чытач убачыць у быкаўскіх герояў не толькі напускную браваду, выкліканую агульным калектывізмам, але і ўласнае стаўленне да праблем, асабістае іх вырашэнне і адказнасць за свой лес.

Відавочна тое, што асаблівасцю персанажаў В. Быкава з'яўляецца паказ не звышчалавека, героя, а звычайнай, простай «букашкі», якая ў крызіснай сітуацыі можа ўвачавідкіператварыцца ў Чалавека (вобраз Сотнікава з аднайменнай аповесці «Сотнікаў»), а можа даволі нізка ўпасці, адысці ў нябыт (вобраз Рыбака з таго ж твора). На наш погляд, гэтыя два персанажы з'яўляюцца ключавымі ва ўсей творчасці пісьменніка. Якой бы ні была тэматыка твораў аўтара, ен імкнецца давесці да чытача думку: чалавек - зямное стварэнне, слабое і палахлівае. Але ў памежнай сітуацыі ен павінен адкрыць у сабе моц і наступіць на горла ўласным страхам - не таму, што будзе ў адваротным выпадку асуджаны людзьмі, грамадствам і г.д., а таму, што часам хвіліна вызначае ўсе далейшае жыцце і лес чалавека, і ў гэтай хвіліне, у выбары рэалізуецца чалавечая свабода, здольнасць самому абраць свае сапраўднае ці несапраўднае існаванне.

На нашу думку, нельга падзяліць персанажы твораў В. Быкава на станоўчыя і адмоўныя нават па той прычыне (і аўтар імкнецца давесці гэтае меркаванне), што ў кожнага чалавека заўседы есць хоць часам і хвілінная, але магчымасць выбару. А ў такім выпадку, як напісаў паэт: «Каждый выбирает по себе: женщину, религию, дорогу. Дьяволу служить или Пророку - каждый выбирает по себе». Няма станоўчых ці адмоўных герояў - есць абставіны. Нават сам пісьменнік у размове з А. Адамовічам выказаў думку пра тое, што чалавек заўседы заціснуты з двух ці нават чатырох бакоў і не свабодны ў сваіх дзеяннях, што генерал Уласаў у другіх абставінах мог бы быць маршалам, а стаў здраднікам. Той жа Хведар Роўба ў аповесці «Аблава», будучы чалавекам сумленным, выбірае смерць як асабістае

збавенне, думаючы пра тое, што прыдзецца здацца ўладам і ўласнаму сыну, разумеў смерць як непазбежнасць: ««Не, ужо не вылезу!» - з панылай злосцю сказаў ен сабе ў думках... Шляху назад не было. ...Ен ужо быў для іх недасяжны. Ен яшчэ не дабрыў да таго свету, але ўжо бадай што сышоў з гэтага» [1, с. 380 - 381]. Сотнікаў таксама выбірае смерць, адцаўшы ей перавагу перад несапраўдным жыццем - служэнню немцам.

Пісьменнік удала выкарыстоўвае ў сваей творчасці матыў дарогі. На нашу думку, гэта сімвал жыццевага шляху чалавека, і кожны сам выбірае сваю «дарожку»: «Гэтую лесавую дарожку ен (Войцік) трохі запомніў з учарашняга... Аднак у змрочным хваевым лесе дарожка стала болей прыкметнай» [1, с. 35]. Далей чытаем: «Пакуль развіднела, ен (Роўба) быў ужо ў лесе, раздумна плеўся па блытаных, пратаптаных... сцяжынках і думаў, ...вузенькай дарожкай паміж магіл прайшоў праз густы змрок тоўстых хвояў і выйшаў з-пад іх на вясковую вуліцу» [1, с. 352 - 353]. У выкарыстанні дадзенага сімвала відавочныя фальклорныя матывы, варта прыгадаць народныя казкі з выбарам галоўным героем свайго шляху: «Налево пойдешь - коня потеряешь, направо пойдешь - ничего не найдешь, прямо пойдешь - себя потеряешь и никуда не придешь» (у розных варыянтах).

У 2003 г. пабачыла свет кніга ўспамінаў В. Быкава «Доўгая дарога дадому», дзе будуць змешчаныя матэрыялы, якія дэталева апісваюць жыццевы і творчы шлях знакамітага пісьменніка. Адзначым, што кніга мае сімвалічную назву - відавочны матыў дарогі, якую пісьменнік прайшоў у жыцці: дарогі да сваей краіны, да свайго чытача, да роднага дома і, урэшце, да самога сябе.

Вельмі паказальны ў плане выбару эпізод з аповесці «У тумане». Смерць, найчасцей, з'яўляецца непазбежнасцю, да ўсведамлення якой прыходзіць чалавечае сумленне. Галоўны герой аповесці Войцік робіць самастойны выбар: «Немец Гросмаер скруціў яго лес, але ен не пераможа ягонае волі. Ягоная вольная воля - можа, тое адзінае, што засталося непадлеглым нікому. Усе ж ен памрэ на свой выбар...» [1, с. 95-96].

Ва ўсей творчасці В. Быкава выразна прасочваецца наступная тэма: пошукі чалавекам самога сябе, свайго месца ў свеце. Пісьменнік ставіць свайго героя ў крызісную (памежную) сітуацыю, з якой можна выбрацца толькі дзвума шляхамі: або абраць жыцце, пазбавіўшыся ўласнай годнасці і пераступіўшы маральныя і боскія законы, або памерці, вызваліўшыся ад несапраўднага, паўсядзеннага, брыдкага існавання.

Відавочна тое, што В. Быкаў, будучы чалавекам сумленным і даказаўшы гэта ўласным жыццем і творчасцю, імкнецца пераканаць чытача, што другі шлях часам бывае адзіным, правільным і непазбежным. Дзеля гэтага пісьменнік выкарыстоўвае прыем унутранага маналога героя: персанаж вядзе гутарку з самім сабой, аналізуючы сітуацыю, як бы прапускаючы абставіны праз сябе, падключаючы свае сумленне, праектуе іх на будучыню і знаходзіць для сябе адзінае выйсце - смерць. Як вынік, у творах В. Быкава большасць эпізодаў мае менавіта такую развязку. Але хочацца адзначыць, што эпізоды гэтыя маюць не трагічны, а наадварот, жыццесцвярджальны пафас, прапагандуючы набыцце чалавекам самага для яго дарагога і жаданага - пачуцця вызвалення ад абставін. Гэты адыход ад суб'ектыўнасці і завецца ў В. Быкава свабодай. Чалавек у памежнай сітуацыі, абраўшы для сябе адзінае выйсце, у пэўны момант знаходзіцца ў суладдзі са сваей душой і нават з цэлым Сусветам - чалавек становіцца самім сабой. Момант гэты, на нашу думку, каштуе больш за ўсе папярэдняе несапраўднае, калектыўнае чалавечае жыцце. Чалавек, аднак, не павінен адыходзіць у нябыт, знікаючы бясследна. Ен павінен працягваць жыць: у спадчыне, якую пакінуў, у сваіх нашчадках, ва ўсходах і заходах сонца, у ачышчальных кроплях дажджу.

В. Быкаў хоча сказаць сваім чытачам: «маленькі чалавек» са сваім нябачным на першы погляд жыццем, са сваім ціхім, непрыкметным адыходам - гэта частка агульнага цэлага, вялікага і каштоўнага, што завецца Сусветам. І думку гэтую яскрава ілюструюць радкі самога аўтара з аповесці, што мае такую сімвалічную назву «Мертвым не баліць»: «...Воля і мір - занадта кволыя дрэўцы, каб іх можна было вырасціць без усеагульнага клопату... Дух свабодалюбства і непадлегласці злу здабыў сабе... магутныя крылы. Я веру, яны не апусцяцца. Струмені свежага... паветра цякуць у мае грудзі. Мне добра...» [1, с. 310].

## ЛІТАРАТУРА

1. Быкаў В. У тумане. - Мн.: Мастацкая літаратура, 1989. - 382 с.